**А. М. Кушнярэвіч**

# РОЛЯ ГЕРМАНСКАГА ФАКТАРУ Ў РАЗВІЦЦІ ЭКАНОМІКІ І ПРАМЫСЛОВАСЦІ БЕЛАРУСІ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

Статья посвящена роли германских капиталов, предпринимателей и специалистов в развитии экономики и промышленности Беларуси XIX – начала XX в. Названы основные уровни развития белорусско-германских экономических связей того времени. Охарактеризован ассортимент белорусского экспорта в Германию и перечислены основные промышленные товары, ввозимые с этой страны в Беларусь. Обращено внимание на то, что упомянутые предприниматели и специалисты сосредотачивали свои устремления на наиболее технично оснащенных и технологически сложных предприятиях белорусской экономики того времени – текстильной, химической, бумажной промышленности, металлообработке и машиностроении.

Беларуска-германскія эканамічныя сувязі маюць шматвяковую гістарычную традыцыю. Яна заключаецца не толькі ў гандлёвых кантактах яшчэ з часоў Ганзы, але і ахоплівае больш шырокі спектр эканамічнага супрацоўніцтва – ад пераносу новых тэхналогій і да асабістага ўдзелу прамыслоўцаў ў развіцці эканамічнага і прамысловага патэнцыялу беларускіх зямель. Таму мэта публікацыі – ахарактарызаваць ролю германскіх капіталаў, прадпрымальнікаў і прамыслоўцаў у развіцці эканомікі і прамысловасці Беларусі XIX – пачатку XX ст. у рамках распрацоўкі аднаго з раздзелаў індывідуальнай навуковай тэмы, прысвечанай беларуска-германскім этнакультурным кантактам XIII–XIX стст. ва ўсёй іх разнастайнасці.

Найперш неабходна адзначыць, што ўсталяванню стабільных беларуска-германскіх эканамічных сувязяў спрыяла наяўнасць агульных межаў паміж германскімі землямі і тымі дзяржавамі, у склад якіх уваходзілі беларускія землі – Вялікім Княствам Літоўскім, Рэччу Паспалітай і Расійскай імперыяй. У развіцці гэтых сувязяў у XIX – пачатку XX ст. можна выдзеліць тры ўзроўні. Па-першае, гэта міждзяржаўныя адносіны Расійскай імперыі і Германіі і іх уплывы на развіццё народнай гаспадаркі беларускіх губерняў. Па-другое, гэта месца, якое займала Беларусь у знешнім гандлі з Германіяй. Па-трэцяе, гэта непасрэднае вядзенне эканамічнай дзейнасці прадстаўнікамі германскіх дзяржаў на беларускай зямлі.

Міждзяржаўныя расійска-германскія адносіны стваралі ўмовы для рэалізацыі беларуска-германскіх эканамічных сувязяў. У многім на іх развіццё, а таксама сістэмы шляхоў зносін уплывала мытная палітыка дзвюх суседніх дзяржаў – Расійскай імперыі і Каралеўства Прусіі. Напрыклад, мытныя супярэчнасці прывялі ў першай чвэрці XIX ст. да думкі злучыць Нёман і Віслу водным шляхам у абход прускіх зямель. У выніку з’явіўся праект Аўгустоўскай воднай сістэмы на стыку беларускіх і польскіх губерняў, стварэнне якой вялося ў 1824–1839 гг. [1, с. 14–15].

Будаўніцтва чыгункі ў беларускіх губернях таксама было праблемай міждзяржаўнай палітыкі. У 1861 г. Таварыства Кёнігсбергска-Лыкскай чыгункі прапанавала царскаму ўраду працягнуць гэту дарогу да Гродна, а ў перспектыве

і да Пінска. Пазней гэтая прапанова была паўторана прускім пасланнікам у Пецярбургу і Усходне-Прускім Таварыствам чыгунак. Аднак папярэднія ўмовы, выказаныя расійскім Камітэтам чыгунак, не задаволілі прускі бок, у выніку ў 1873 г. Брэст  і Граева на прускай мяжы злучыла 199-вёрстная чыгунка, пабудаваная расійскім акцыянерным таварыствам [2, с. 87].

Развіццю ўстойлівых эканамічных сувязей паміж беларускімі губернямі і нямецкімі землямі садзейнічала наяўнасць прамых водных шляхоў зносін, дапоўненых у другой палове XIX ст. чыгункамі. Цікава, што амаль манапольнае месца ў лясным гандлі з Германіяй належала Беларусі. Гэтаму садзейнічалі лясныя рэсурсы беларускіх губерняў і параўнаўчая таннасць і зручнасць дастаўкі ляснога тавару водным шляхам на германскія лясныя рынкі. Пры гэтым попыт на беларускі лес пастаянна ўзрастаў. У апошняй трэці XIX ст. пачала складвацца даволі зладжаная сістэма беларускага ляснога экспарту ў Германію. У многім гэта звязана са значным пашырэннем ляснога гандлю пасля адмены ў 1868 г. вывазной пошліны на лес. З басейна Нёмана лес сплаўляўся ў Тыльзіт і Мемель. Беларускае Палессе ў асноўным было арыентавана на Заходні Буг, а далей па Вісле лес дастаўляўся ў Бромберг і Данцыг. Акрамя прамога сплаву па рэках беларускі лес трапляў у Германію і праз балтыйскія парты Расійскай імперыі (Пецярбург, Кранштат, Рэвель, Пернаў, Рыга, Віндава, Лібава). Пры гэтым амаль палова ляснога экспарту праходзіла праз Рыгу, куды лес вывозіўся ў асноўным з беларускага Падзвіння і з басейна Беразіны па аднайменнай воднай сістэме.

Часам нямецкія прадпрымальнікі займаліся самастойнай распрацоўкай лясных нетраў Беларусі. Стабільна ўзрастаў і экспарт у Германію прадукцыі беларускай сельскай гаспадаркі, у прыватнасці мяса. З Германіі ў беларускія губерні ўвозіліся прамысловыя тавары. К канцу XIX ст. вырас увоз у беларускія губерні машын і абсталявання вытворчасці нямецкіх фірм. Так, буйнейшыя заводы Германіі сельскагаспадарчага машынабудавання прапаноўвалі беларускім спажыўцам сваю прадукцыю (конныя і ручныя малацілкі, касілкі, снопавязалкі).

Майстры і рамеснікі з Германіі здаўна былі вядомыя на беларускіх землях. Сярод беларускіх губерняў вялікай колькасцю немцаў-прадпрымальнікаў і рабочых выдзялялася Гродзенская губерня. Прычынай гэтага з’яўляецца не толькі блізкасць прускай мяжы, але і наступствы эканамічныхператварэнняў, якія ў эпоху заняпаду Рэчы Паспалітай спрабаваў правесці на гродзенскай зямлі граф Антоні Тызенгаўз. Нават пасля 1795 г. не ўсе замежныя майстры, запрошаныя ім для працы ў Гродзенскай эканоміі, вярнуліся на радзіму [1, с. 17–18].

Як правіла, і ў далейшым германскія прадпрымальнікі і прамыслоўцы засяроджвалі свае намаганні на найбольш тэхнічна абсталяваных і тэхналагічна складаных прадпрыемствах беларускай эканомікі таго часу – тэкстыльнай, хімічнай і папяровай прамысловасці, металаапрацоўцы і машынабудаванні. Германскіх майстроў ахвотна наймалі на свае прадпрыемствы беларускія прадпрымальнікі. Так, у многім дзякуючы ім і завезенаму з Германіі абсталяванню, паспяхова пачала дзейнічаць суконная фабрыка Аляксандра Скірмунта,

адкрытая ў 1836 г у Парэччы. У хуткім часе яна стала лепшай беларускай тэкстыльнай фабрыкай. У 1851 г. на ёй працавалі прускія падданыя – суконшчык Франц Коммес і шпільмайстар Вернар Цэллер [3, с. 31–33]. На Адахоўскай суконнай фабрыцы (Навагрудскі ўезд) у памешчыка Казіміра Рдултоўскага ў 1840 г. былі не толькі “машыны замежныя”, але і чатыры майстры-немцы. Тады ж 9 майстраў і 20 рабочых з Прусіі працавалі на суконнай фабрыцы ў мястэчку Ізабелін. Германскія прадпрымальнікі неслі на беларускія землі ініцыятыву і вытворчы вопыт. Напрыклад, выхадзец з Прусіі Эдуард Ціль з 1851 г. займаўся пабудовай бяролін у маёнтку Сінчыцах Пінскага ўезда. У гэтым жа ўездзе яго суайчыннік Іаган Кірш з 1849 г. працаваў хімікам на Альбрэхтаўскім стэарынавым заводзе. З 1877 г. функцыянаваў у Мінску мылаварны завод прускага падданага Б. Блімовіча. Чыгуна-ліцейны і механічны завод Рудольфа Шмідта ў Брэсце, адкрыты ў 1870 г., праводзіў рамонт сельскагаспадарчых машын і абсталявання. Адну з першых у Беларусі аўтарамонтную майстэрню адкрыў у пачатку XX ст. у Віцебску германскі падданы Гуго Ленгельфельд. Ён жа з’яўляўся гандлёвым прадстаўніком аўтамабільнай фірмы “Комнік” з Эльблонга. Германскі падданы Іаган Лютберг валодаў у пачатку стагоддзя ў Стоўбцах каўбаснай крамай з гадавым абаротам 10 тыс. руб. Яго суайчынніку Густаву Баўэру належылі тры каўбасныя крамы ў Мінску: па Губернатарскай вуліцы ў доме Поляка, па Захар’еўскай вуліцы ў доме Машкілейсана і па Грыгор’еўскай вуліцы ва ўласным доме. Аднак па-ранейшаму найбольшая колькасць германскіх прадпрымальнікаў даводзілася на Гродзенскую вобласць. Самыя ж буйныя прадпрыемствы, якія належалі германскім падданым, былі ў лясной прамысловасці. Прадпрымальнікі з Германіі працавалі не толькі ў прамысловасці, але і ў сельскай гаспадарцы Беларусі. Пры гэтым варта адзначыць, што наяўнасць замежнікаў у кіраўнічым апараце была даволі распаўсюджанай з’явай у беларускіх маёнтках, імі часцей за ўсё станавіліся падданыя германскіх дзяржаў. Адным з найбольш яркіх прыкладаў узорнай сельскагаспадарчай вытворчасці другой паловы XIX ст. з’яўляюцца валоданні графа Храптовіча, які поспехамі ў многім абавязаны ўмелым дзеяннем сваіх кіраўнічых кадраў. З 1851 г. у фальварку Мураванка служыў эканомам прускі падданы Карл Аўгуст Браўн, а ў маёнтку Шчорсы – віртэнбергскі падданы Вільгельм Фаазэ. Саксонскі падданы Фердынанд Фішэр служыў больш за сорак гадоў галоўным упраўляючым маёнткамі графа Храптовіча – Шчорсамі і Вішнева ў Мінскай губерніі і Бешанковічамі ў Віцебскай губерніі [1, с. 19]. Немцы займалі ў беларускіх маёнтках і больш нізкія адміністрацыйна-гаспадарчыя пасады. Так, у першай чвэрці XIX ст. у Гомельскім маёнтку графа Н. П. Румянцава працавалі эканомы Оландэр і Шеленберг, бухгалтар Грум, ветэрынар Гейслед, гадзіннікавы майстар Цідэман, булачны майстар Тарант, столяр Фогель, півавар Вольфарт, механік Енгель, ліцейны майстар Ланге, меднік Мілер [4, с. 23].

Уплывы германскіх капіталаў праявіліся і на формах арганізацыі прамысловасці. Характэрным узорам у гэтых адносінах з’яўляецца рэалізацыя ініцыятывы дырэктара Добрушскай папяровай фабрыкі А. І. Стульгінскага

аб стварэнні Саюза фабрыкантаў па вытворчасці паперы па ўзору Verein’a Deutscher Papierfabrikanten. Да таго ж А. І. Стульгінскі быў асабіста знаёмы з арганізацыяй папяровай прамысловасці Германіі, бо ў пачатку 70-х гг. XIX ст. наведаў папяровыя фабрыкі ў Вертгейме (паблізу Гановера) і ў Гайнсбергу (паблізу Дрэздэна). Яго артыкулы, прысвечаныя тэхналогіі вытворчасці паперы, друкаваліся ў нямецкіх навукова-тэхнічных выданнях («Papier Zeitung» і інш.). А. І. Стугельскі ўкараніў у Добрушы шэраг перадавых тэхналогій нямецкіх папяровых фабрык. Частка абсталявання Добрушскай папяровай фабрыкі – найбольш тэхнічна дасканалага беларускага прадпрыемства таго часу – была прывезена з Германіі. Нямецкае абсталяванне стаяла і на Добрушскай электра-станцыі, адкрытай у 1889 г. – першай на тэрыторыі Беларусі.

У XIX – пачатку XX ст. германскія капіталы і нямецкія прадпрымальнікі займалі першае месца сярод замежных эканамічных партнёраў Беларусі. На працягу гэтага часу беларуска-нямецкія эканамічныя сувязі мелі ўстойлівую тэндэнцыю свайго росту як у колькасных так і якасных адносінах. Гэтым сувязям уласцівы не разавы, а стабільны характар і ахаплівалі яны практычна ўсе ўзроўні эканамічнага супрацоўніцтва ад міждзяржаўнай эканамічнай палітыкі да асабістага ўдзелу ў развіцці эканомікі двух народаў. Маштабы германа-беларускіх эканамічных сувязяў і паўната іх форм, якія былі дасягнуты ў ходзе развіцця рынкавых адносін і эканамічнай эвалюцыі XIX – пачатку XX ст., не былі перасягнутыя на працягу ўсяго наступнага гістарычнага перыяду [1, с. 20–21].

Такім чынам, германскія капіталы, прадпрымальнікі і адмыслоўцы былі даволі важкімі як у колькасных, так і якасных адносінах на Беларусі, што садзейнічала яе інтэграцыі ў еўрапейскую эканамічную сістэму. Яны выступаюць як істотны фактар паступовага развіцця германа-беларускіх эканамічных адносін у гэты час. Германа-беларускае эканамічнае ўзаемадзеянне ў разглядаемы час сведчыць пра здольнасць айчыннай прамысловасці да ўспрымання перадавых заходніх тэхналогій.

Літаратура

1. *Киштымов, А.* Германские капиталы и немецкие предприниматели в экономике Беларуси XIX – начала XX в. // Беларусіка – Albaruthenica. Кн. 7. Беларуска-нямецкае грамадска-культурнае ўзаемадзеянне: гісторыя, сучаснасць, перспектывы / рэд.: Л. Кулажанка, А. Мальдзіс. – Мінск, 1996. – С. 13–21.
2. *Дякин, В. С.* Германские капиталы в России / В. С. Дякин. – Л. : Наука, 1971. – 170 с.
3. *Киштымов, А.* Скирмунты: династия предпринимателей / А. Киштымов // Деловой вестник. – 1994. – № 9–10. – С. 30–35.
4. *Кіштымаў, А.* Гомельскі маёнтак графа М. П. Румянцава: вопыт гаспадарання / А. Кіштымаў // БГЧ. – 1995. – № 1. – С. 21–25.

*Поступила в редакцию 16.03.2022*